# КОЛЛОКВИУМ
## Секция 1.3

| | |
|---|---|
| Председатель | *Зылевич Дина Павловна*, доцент кафедры редакционно-издательских технологий, доцент, кандидат филологических наук |
| Секретарь | *Тарасевич Ксения Тарасовна*, студентка 4 курса факультета ПиМ |

УДК 821.161.3 – 801.73

Д. Жылінская, вучаніца 6 класа
(Гімназія №1, г. Дзяржынск)

### ЗБОРНІК М. БАГДАНОВІЧА "ВЯНОК": МАСТАЦКІ ЧАС І МАСТАЦКАЯ ПРАСТОРА

Усім вядома, што "Вянок" – гэта адзіны прыжыццёвы паэтычны зборнік паэта Максіма Багдановіча. Даследчая работа звяртаецца да паэтычнай прасторы і часу зборніка "Вянок". Таму мэта работы – аналіз катэгорый часу і прасторы ў зборніку Максіма Багдановіча.

Аб'ект даследавання – лірычная паэзія зборніка "Вянок". Прадмет даследавання – катэгорыі хранатопу ў паэзіі Багдановіча.

Даследаванне вялося на матэрыяле факсімільнага выдання зборніка "Вянок", а гэта значыць, што яно не закранае аб'ёмны цыкл "Каханне і смерць", бо, як вядома, праз памылку Багдановіча ў нумарацыі раздзелаў, гэтыя вершы не былі спачатку ўключаны ў зборнік.

Хранатоп – утвораны ад двух грэчаскіх слоў: хронас - час і топас – месца.

Упершыню гэты тэрмін выкарыстаў Міхаіл Міхайлавіч Бахцін, рускі лінгвіст і даследчык творчасці Дастаеўскага. Аднак першапачаткова паняцце хранатопу выкарыстоўвалася толькі ў адносінах да прозы, пазней жа яго сталі адносіць і да паэзіі.

Трэба адзначыць, што праблемай хранатопу ў паэзіі М. Багдановіча займаліся Т. Хоміч, якая даследавала ўвасабленне горада ў яго творчасці, а таксама Т. Шамякіна, якой былі цікавы міфалагічны хранатоп паэта.

Для аджыццяўлення даследавання было прааналізавана 89 вершаў зборніка "Вянок", у 62 з іх – выразна акрэслены хранатоп. У астатніх жа мастацкі час і мастацкая прастора – абстрактныя.

У хранатопе прынята вылучаць сезонны час і час сутак.

Такім чынам, у Максіма Багдановіча два вершы ляжаць у межах мастацкай восені ("Прывет табе жыццё на волі...", "Плакала лета, зямлю пакідаючы..."), два – лета ("Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог..." і "Ад спёкі пышуць дахі і асфальт..."), мастацкі час трох вершаў – вясна ("Перад паводкай", "Маёвая песня" і "Непагодаю маёвай") і мастацкі час васьмі вершаў – зіма ("Зімой", "Зімовая дарога", "Завіруха", і іншыя).

Але нават вясна ў Багдановіча шэрая і трывожная, як у вершы "Перад паводкай" ці "Непагодаю маёвай".

Падаюць вішняў цвяты, і разносіць іх вецер халодны;
Снегам у чорную гразь падаюць вішняў цвяты.
Плачце, галіны, лісты! Загубілі вятры цвет ваш родны,
Не к чаму болей вам жыць. Плачце, галіны, лісты!

Яшчэ больш цікавая карціна назіраецца, калі прааналізаваць суткавы хронас паэзіі Багдановіча. У 21 вершы дзеянне адбываецца вечарам, які плаўна пераходзіць у ноч (Добрай ночы, зара-заранiца!", "Ноч. Газніца гарыць, чырванее", "Вечар", "Ціхі вечар; знікнула спякота", "Халоднай ноччу на халодным, цёмным полі...").

Таксама мне было цікава разглядзець сімвалы мастацкага часу Багдановіча. Найбольш пашыраныя з іх – раса, месяц і зоркі. Так апошні сімвал выкарыстоўваецца ў 23 вершах. Аднак у Багдановіча гэта сімвал тугі, гора, смутку. Аб чым сведчаць паэтычныя прыклады:

Сумна плыве маладзік бледна-сіні,
Іскрацца зорак сняжынкі маркотна... ("Вечар на захадзе ў попеле тушыць...")

Месяц белы, заплаканы,
Аглядае маркотныя зоркі. (“Над возерам”)

Заззяе серабром іголак
Зор грамада… (“Прывет табе, жыццё на волі…”)

Такім чынам, хронас паэта Багдановіча звязаны са смуткам і паміраннем жыцця, аб чым сведчыць яго часты зварот да вобразаў зімы, восені, ночы, самотнага месяца і зорак.

Яшчэ больш цікавыя адкрыцці чакалі ў мастацкай прасторы паэта. У гэтым кантэксце я прааналізавала выдуманую і геаграфічную мастацкую прастору, а таксама насельнікаў прасторы – міфічных істот.

З 33-ох вершаў, у якіх выразна акрэслены топас, у 14-ці прастора размешчана ў межах лесу каля возера (прычым у Багдановіча гэтыя два кампаненты непарыўна звязаны), у 13 – дарога і поле, 5 – горад, вуліцы горада (гэта гарадскія вершы з цыкла “Места”), 3 – манастыр (Цыкл “Старая Беларусь”) і 3 – ў звычайнай хаце.

Геаграфічны хронас прадстаўлены больш сціпла: Нёман (верш “Перад паводкай”, Вільня (вершы цыкла “Места”) і Егіпет і рака Ніл (“Санет”).

Трэба адзначыць, што мастацкая прастора М. Багдановіча амаль не населена чалавекам, затое ў ёй прысутнічаюць шматлікія міфалагічныя перасажы. Асабліва іх багата ў цыкле “У зачарованым царстве”. Гэта і лясун, і вадзянік, і русалка, і мара, і змяіны цар.

Настрой мастацкай прасторы заўсёды надае надвор’е. Толькі два вершы ў Багдановіча, дзе пануе выключна добрае надвор’е: “Плакала лета, зямлю пакідаючы” і “Ціхі вечар, знікнула спякота”.

А вось у адзінаццацці дзеянне адбываецца ў час дажджу (“Дзесь у хмарах плывуць павукі…”, “Разрытая магіла”, “Напілося сонца са крыніц сцюдзёных…”), буры і навальніцы (“Бура”, “У небе ля хмары грымотнай”, “Устань, навальніца, мкні нанова”), завірухі, снегападу (“Завіруха”, “Была калісь пара: гучэла завіруха…”) і інш.

Такім чынам, хранатоп паэзіі Максіма Багдановіча выразны і цалкам абумоўлены светаадчуваннем паэта. Яго лірыка знаходзіцца ў межах мастацкага часу зімовай ці асенняй ночы або вечара, дзеянне найчасцей адбываецца ля возера ў лесе ці на палявой дарозе.

Вобразы-сімвалы самотных зорак, месяца, непагоды, міфалагічных істот падкрэсліваюць трагізм аўтара. Вядома, што паэт усё жыццё змагаўся з туберкулёзам і пастаянна знаходзіўся ў чаканні смерці, гэтым і абумоўлены зварот да такога ж нярадаснага хранатопу.

Веданне жыццёвых рэалій аўтара – заўсёды ключ для разумення паэзіі. У выпадку з хранатопам гэта думка падцвярджаецца поўнасцю.

ЛІТАРАТУРА

1. Багдановіч М. Поўны збор твораў у трох тамах. – Мн.; “Навука і тэхніка”, 1991
2. Зубraраў Л. Максім Багдановіч. – Мн.; “Універсітэцкае”, 1989
3. Лазарук М. “Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў”. – “Народная асвета”, 2003
4. Факсімільнае выданне зборніка “Вянок”.

УДК 821.161.3 – 801.73

Ю. Зуева, вучаніца 9 класа
(Гімназія № 1, г. Дзяржынска)

## ТЭКСТАЛОГІЯ ВЕРША М. БАГДАНОВІЧА “СЛУЦКІЯ ТКАЧЫХІ”

Для творчасці паэта Максіма Багдановіча характэрны няспынны пошук і творчае ўдасканаленне. Вынікам гэтага стала варыянтнасць яго шматлікіх вершаў, сярод якіх і знакаміты твор “Слуцкія ткачыхі”. Існуе рэдакцыя 1912 года (якраз яна вядома нам са школьнага курса літаратуры), а таксама больш пазнейшая, пазначаная 1915 годам. Актуальнасць даследавання заключаецца ў тым, што спрабуецца даць ацэнку абедзвюм рэдакцыям верша праз падрабязны літаратуразнаўчы аналіз.